

# Рыйн Алаталу

эстонскі гісторык і этнолаг, доктар гуманітарных навук, прафесар Талінскай акадэміі мастацтваў. З 2004 года працавала ва Упраўленні па ахове культурнай спадчыны Эстоніі, была кіраўніком Аддзела навакольнага асяроддзя Талінскага ўпраўлення культурнай спадчыны. Як старшыня Эстонскага камітэта, у 2020 г. яна была абрана віцэ-прэзідэнтам ICOMOS. Старшыня Рады па ахове спадчыны Эстоніі, аўтарка мноства публікацый.

Фота pealinn.ee

# Рыйн Алаталу: Наш гістарычны шанец – быць прамоўтэрамі ідэй устойлівага развіцця!

## Riin Alatalu: Our Historic Chance is to be Promoters of Sustainable Development!

**In July 2022, Dr. Riin Alatalu, Vice President of ICOMOS and Chairman of the Estonian Council for Cultural Heritage participated in the EHU Summer School "Cultural Heritage and the Future". Besides that, Dr. Alatalu always supports the Belarusian National Committee of ICOMOS and is interested in maintaining cultural ties with Belarusian civil society. We consider it a great privilege to engage with experts of such international caliber. In this interview, we talked about the current and future challenges of the heritage sector, as well as ways for this sector to emerge from Soviet approaches to heritage preservation and management.**

Адной з ключавых дакладчыц летняй школы «Культурная спадчына і будучыня», праведзенай у ліпені 2023 года ў ЕГУ, была доктар Рыйн Алаталу – гісторык, выкладчыца Эстонскай акадэміі мастацтваў і старшыня эстонскага Савета па ахове спадчыны. У 2020 годзе яна змяніла пазіцыю старшыні Эстонскага нацыянальнага камітэта ІКАМОС на пазіцыю віцэ-прэзідэнткі ўсёй міжнароднай арганізацыі. Выклікае захапленне, што вопыт і энергія эксперткі з роднаснай нам балтыйскай краіны сталіся настолькі запатрабаванымі і ў глабальным маштабе!

Доктар Алаталу – самы правільны чалавек, каб пагутарыць не проста пра бягучыя глабальныя дыскусіі аб захаванні спадчыны, але і прымерыць іх на нашу постсавецкую культурную і эканамічную сітуацыю. Усё ж Эстонію і Беларусь яднае вопыт доўгатэрміновага знаходжання ў складзе СССР і наступнага (не)пераадолення шматлікіх наступстваў гэтага перыяда. Вось якая гутарка ў нас атрымалася.

Першае пытанне – што сёння на парадку дня ў Міжнародным ІКАМОСе? Якія праблемы абмяркоўваюцца зараз? Якія Вашыя чаканні ад наступнай Генеральнай ассамблеі ІКАМОС, што адбудзецца ў верасні 2023 года ў Сіднэі?

Якое простае пытанне! *(смяецца)* Зараз у нас на стале шмат праблем і пытанняў. Адно з самых важных – нарошчванне патэнцыялу экспертных арганізацый, такіх як сам ІКАМОС, у вырашэнні вялікіх крызісаў. Канешне, сярод іх першае месца займае вайна ва Ўкраіне. Яна ўразіла ўсю Еўропу! Наступны крызіс звязаны з землятрусамі

ў Турэччыне. Але ёсць і іншыя крызісы, што адбываюцца па ўсім свеце і тычацца культурнай спадчыны, а таксама стасункаў грамадства з ёй. Кожны крызіс мае шмат вымярэнняў. Адно з іх – што мы можам зрабіць, каб дапамагчы нашым непасрэдным калегам? Наступнае – што мы можам зрабіць, каб дапамагчы мясцовым супольнасцям? А яшчэ працэс аднаўлення! Гэта складаны працэс, і нельга дапусціць, каб ён набыў прыкметы бізнэса. Хіба, слова «бізнэс» тут не найлепшае, але мне цяжка зараз падабраць іншае. Я маю на ўвазе, што за права аказаць шчырую дапамогу таксама ўжо прыходзіцца змагацца, таму што некаторыя агенты навучыліся на ёй зарабляць. І вось як зрабіць так, каб наша экспертыза ў рознабаковых працэсах захавання культурнай спадчыны заставалася запатрабаванай, каб у працэсе аднаўлення не нарабіць большай шкоды аб'ектам спадчыны?

Рэнамэ ІКАМОСа ў гэтым сэнсе дастаткова добрае, але ж ІКАМОС – гэта даволі абмежаванае кола людзей, і тут шмат залежыць ад агульнага разумення ролі культурнай спадчыны ў захаванні ідэнтычнасці мясцін. Зварот да спадчыны важны не толькі ў кантэксце аднаўлення разбуранага, але і ў працэсе планавання развіцця гарадоў і тэрыторый. Таму, акрамя вышэйназванага, экалагічная ўстойлівасць і забеспячэнне рэалізацыі культурных правоў у глабальным маштабе – таксама на парадку дня.

Нарэшце, пытанне ўключанасці ўніверсітэтаў і наогул сістэмы вышэйшай адукацыі ў пытанні кіравання культурнай спадчынай і выкарыстання яе патэнцыяла. Нам хацелася б стварыць пад эгідай ІКАМОСа міжнародную сетку ўніверсітэтаў, каб быць больш уплывовымі. Мы, універсітэцкая прафесура, можам стымуляваць працэс студэнцкіх і навуковых абменаў, ствараць сумесныя міжнародныя і міждысцыплінарныя праграмы, і праз гэта таксама павышаць ролю экспертаў, і ўрэшце – ролю самога ІКАМОСа. Гэта, дарэчы, можа быць асабліва рэлевантным і для вас у Еўрапейскім Гуманітарным Універсітэце.

А якая, на Ваш погляд, прырода памянёнага вамі крызіса рэнамэ экспертных ведаў, ІКАМОСа, і ў цэлым сферы прафесійнага захавання культурнай спадчыны? Я пытаю пра гэта таму, што напачатку 1990-х гадоў, прынамсі ў нашым рэгіёне Еўропы, лічылася, што вось цяпер ужо, пасля дасягнення незалежнасці былымі савецкімі рэспублікамі, захаванню культурнай спадчыны больш нічога не пагражае, бо гэта будзе адным з прыярытэтаў нацыянальнай палітыкі. І вось цяпер вы акрэсліваеце наяўнасць крызіса…

Менавіта! Я думаю, крызіс наступіў таму, што для нас 1990-я гады былі перыядам змен, часам нацыянальнага адраджэння ва Ўсход-

няй Еўропе. Думаю, яны паўплывалі на ўвесь свет, асабліва на маленькія краіны, на тое, як яны паглядзелі на ўласную ідэнтычнасць. Гэтым краінам сталі аказваць больш падтрымкі ў яе захаванні. Гэта, дарэчы, было падобна да таго, што адбывалася раней, у XIX і на пачатку XX стагоддзя, калі ў 1918 годзе таксама адбылося паўстанне новых нацый. Я кепска ведаю, што адбываецца ў Беларусі, але зараз у Эстоніі я бачу, як пытанне нацыянальнай ідэнтычнасці саступае развіццю бізнэса і дэвелапменту нерухомасці. Захаванне спадчыны – ўжо не першачарговая задача. Тое самае можна назіраць ў шматлікіх іншых краінах, не толькі ва Ўсходняй Еўропе. Я бачу падобныя тэндэнцыі па ўсім свеце.

Дык вось, сёння наша задача, наш гістарычны шанец у тым, каб быць прамоўтэрамі ідэй устойлівага развіцця, таксама і ў святле глабальнага пацяплення. У гэтым сэнсе нам дапамагае Еўрапейская дырэктыва аб энергетычных характарыстыках будынкаў, галоўны сэнс якой у забеспячэнні ўстойлівасці. Там размова вядзецца аб аднаўляльнай энергетыцы, аб будынках з нулявым выкідам вугляроду, і мы мусім пераканаць усіх, што захаванне культурнай спадчыны, архітэктурнай – галоўная перадумова ўстойлівасці, што захаванне старых будынкаў не можа быць адкладзена ўбок, бо як раз захаванне супрацьстаіць дэвелапменту і, адпаведна, разбурэнню старых канструкцый. Так мы знаходзім новую ролю для культурнай спадчыны, вяртаем яе ў парадак дня нацыянальнага развіцця.

Як бы Вы пракаментавалі дыскусію, якая адбываецца ў мяне са шматлікімі беларускімі калегамі, прафесіяналамі ад спадчыны, якія аспрэчваюць увесь сучасны дыскурс гэтай сферы, усе размовы пра ўстойлівасць, пра кліматычныя змены, пра ўцягненне мясцовых супольнасцей у кіраванне помнікамі і мясцінамі, пра культурныя правы? Яны кажуць: не, гэта ўсё балбатня, нам трэба папросту ўзмацніць сістэму аховы помнікаў; мы мусім шукаць сродкі на кансервацыю і аднаўленне – увесь гэты знаёмы нам комплекс ідэй, павязаных з AHD – класічны дыкурс спадчыны XIX стагоддзя. А мы, паводле іх, замест гэтага абмяркоўваем нешта нерэлевантнае. Што б Вы сказалі?

Я б сказала, што такім чынам яны займаюць толькі адну частку поля, і ім варта было б быць больш адкрытымі да абмеркавання іншых праблем, бо існуе вельмі шмат аспектаў захавання. Але гэтыя дыскусіі ідуць не толькі ў вашай краіне. Калі ізноў прыгадаць Еўрапейскую дырэктыву аб энергетычных характарыстыках будынкаў, можна заўважыць, што Еўрапейскі парламент, негледзячы на напісаную ім вельмі прыгожую прэамбулу, сутыкаецца з праблемай таго, як усе гэтыя ідэі ўвасобіць на ўзроўні краін-чальцоў, дзе

вельмі часта абмеркаванне культурнай спадчыны абмяжоўваецца толькі захаваннем зарэгістраваных будынкаў. Нашым экспертам кажуць: дбайце пра свае помнікі, якія ў спісах, і не турбуйце наш бізнэс! І атрымліваецца, што калі мы абмяжоўваем абмеркаванне праблематыкі спадчыны кансервацыяй і рэстаўрацыяй асобных помнікаў, мы застаёмся ў сваёй вузкай нішы. Але калі мы кажам, што Дырэктыва мае тычыцца ўсіх будынкаў, якія маюць гістарычны патэнцыял, не мае значэння, ці яны ў спісах, ці не, то мы мусім распрацоўваць новыя складаныя рашэнні, мы не можам не браць пад увагу супольнасці, не можам не казаць пра культурныя правы, мы мусім казаць пра экалогію і гэтак далей. То бок гэта нашмат больш шырокае праблемнае поле! Вы можаце, канешне, сканцэнтравацца выключна на ахове, можаце нават уводзіць стандарты захавання аб’ектаў Сусветнай спадчыны, але ці не атрымаецца так, што да ўсяго іншага вам папросту няма справы?... Мы ж, наадварот, прытрымліваемся халістычнага падыхода, тым больш што новыя пакаленні ўжо ствараюць уласную спадчыну, якая яшчэ не ахоўваецца, але мы мусім браць у разлік і гэтыя навейшыя, але ўжо таксама гістарычныя напластаванні.

Адна з найбольш складаных тэм у бягучых дыскусіях аб спадчыне – гэта правы супольнасцей. Парадаксальна, наколькі вялікая колькасць прафесіяналаў са сферы спадчыны, экспертаў, прынамсі ў Беларусі, насамрэч не разумеюць ідэю, якая стаіць за правамі супольнасцяў і партыцыпацыяй. Ва ўсім гэтым яны, наадварот, бачаць пагрозу аб’ектам спадчыны, а таксама пагрозу ўласнай экспертнасці. Маўляў, як можна дапусціць супольнасці да прыняцця рашэнняў? Што б Вы сказалі на гэта?

Справа ў тым, што наогул не існуе спадчыны без адпаведных супольнасцяў. Бо калі мы арыентаваныя толькі на кансервацыю і спажыванне гэтых аб’ектаў, напрыклад водзім да іх турыстаў, ператвараем у музеі, у такім выпадку спадчына папросту губляе жыццё. Але калі мы далучаем супольнасць, калі мы працуем з ёй, наогул бярэм яе ў разлік як важнейшую частку самога месца, мы атрымліваем жывую спадчыну. І такія мясціны становяцца больш устойлівымі, бо ў вырашэнні важных пытанняў прымае ўдзел мясцовая супольнасць. Ізноў жа, людзі паважаюць тое, што ведаюць, і тое, што лічаць сваім, тое, у чым чытэльны іх уласны ўнёсак.

Уцягванне супольнасцяў – гэта ж яшчэ і адукацыйная дзейнасць, гэта таксама магчымасць разабрацца з каштоўнасцю гэтых аб’ектаў: за што іх цэняць, чым яны адрозніваюцца ад іншых? Можа, такія пытанні папросту не прыходзяць у галаву звычайным людзям? Можа, яны не ведаюць, наколькі цікавае месца, у якім яны

жывуць? А яно можа быць цікавым і ў міжнародным, нават глабальным сэнсе. Так што ўцягванне супольнасцей прадугледжвае іх удзел у прыняцці рашэнняў, але такі ўдзел мусіць пачынацца з усебаковага вывучэння аб'ектаў: чым з'яўляецца спадчына, для каго яна што значыць? А потым – з абмеркавання, з пошуку агульнага і разумення адрознага ва ўспрыняцці аб'ектаў і элементаў спадчыны.

Яшчэ я хачу запытаць аб экалагічным патэнцыяле спадчыны. Наколькі рэлевантная сама гэта тэма зараз, таму што ізноў жа нават некаторым экспертам, спецыялістам часам падаецца, што гэта такая даніна дыскурсіўнай модзе. Маўляў, увесь свет гаворыць пра глабальнае пацяпленне, ну і вось ІКАМОС таксама не хоча саступаць. А вось для нашага рэгіёна, для Беларусі, гэта не так істотна.

Насамрэч гэта вельмі рэлевантна! Таму што змена клімата – гэта пытанне рэсурсаў. Як мы выкарыстоўваем нашы прыродныя рэсурсы, як выдаткоўваем энергію? І любы будынак, які бы ён ні быў – гэта таксама наяўны рэсурс. Так што, калі мы паўторна яго выкарыстоўваем, рэканструіруем, рэадаптуем для новых функцый, якія могуць, а могуць і не быць павязаныя з культурай і спадчынай, то мы ўжо робім унёсак у дасягненне кліматычнай устойлівасці. У некаторых еўрапейскіх краінах існуюць даволі дзіўныя законы, якія забяспечваюць падтрымку вялікім праектам па ўзвядзенню будынкаў з нулявым выкідам вуглякіслага газу, нават такім, у якіх адначасова прадугледжваецца экстэнсіўны знос папярэдніх збудаванняў, што суправаджаецца выкідам аграмаднай колькасці шкодных рэчываў, для чаго патрабуецца вялікая колькасць энергіі, і г. д. Такім чынам яны ствараюць значныя праблемы для экалогіі, хаця нібыта пакліканыя пра экалогію дбаць. Так што паўторнае выкарыстанне – гэта выдатная рэч! І гэта, безумоўна, павязана з культурнай каштоўнасцю старога.

Важная тэма, якая нас цікавіць у кантэксце беларускай будучыні – постсавецкі вопыт Эстоніі ў рэфармаванні сферы культурнай спадчыны. Гэта тэма, дарэчы, была тэмай Вашай доктарскай дысертацыі, ну і да таго ж Вы маеце аграмадны практычны вопыт, які ўключае працу ў адпаведным Міністэрстве, і ў адукацыі, і ў рэалізацыі шматлікіх праектаў. Наколькі сфера захавання культурнай спадчыны ў Эстоніі можа сёння апісвацца ў катэгорыях постсавецкасці? Ці яна ўжо пераадолела хваробы пераходнага перыяду, і цяпер выглядае цалкам еўрапейскай?

Дакладна магу сказаць, што яна ўжо не постсавецкая. Але і з адпаведнай сістэмай скандынаўскіх краін нам яшчэ цяжка канкураваць. Розніца палягае ў тым, што ў нас большая частка адказнасці за захаванне аб'ектаў культурнай спадчыны ўсцяж накладаецца на ўладальніка. У скандынаўскіх ці таксама ў шматлікіх іншых заходнееўрапейскіх краінах нашмат лепш развітая сістэма субсідый для ўласнікаў. Мы ж маем мала грошай, і таму гэта справа ўласніка – прыцягненне інвестыцый, рэстаўрацыя і падтрыманне будынкаў. Так што я б сказала, што ў нас яшчэ класічны капіталізм. Шматлікія савецкія інстытуцыі спынілі існаванне, цяпер у нас толькі невялікі Нацыянальны савет па спадчыне, які мае экспертную функцыю і сочыць за выкананнем ахоўнага заканадаўства. Аднак адказнасць – самая вялікая частка справы – на ўласніку.

У той жа час, сёння большую частку аб'ектаў спадчыны ўжо можна лічыць добра задбанай. Канешне, ёсць шмат праблем, але ў цэлым эстонская спадчына ў больш-менш задавальняючым стане.

А як у Эстоніі справы з укараненнем новых падыходаў, заснаваных на забеспячэнні культурных правоў супольнасцяў?

Калі казаць пра канкрэтныя актыўнасці, то мы праводзім шмат трэнінгаў на гэту тэму. Разам з тым, мы працуем над паляпшэннем нашай бюракратычнай сістэмы. Напрыклад, каб унесці будынак у спіс культурнай спадчыны, нам неабходна ўлічваць меркаванне ўласніка. Мясцовая супольнасць можа ўмяшацца ў працэс (гэта не абавязкова, але яны могуць!), так што гэта дастаткова дэмакратычная працэдура. Эстонцы любяць сачыць, што там адбываецца «за плотам у суседа», так што можна сказаць, што нашы супольнасці даволі актыўныя.

Не тое, каб мы вельмі часта ўзгадвалі Канвенцыю Фаро, аднак яе прынцыпы ў цэлым выконваюцца. Гэты дакумент, які мы ратыфікавалі ў 2021 годзе (то бок, па еўрапейскіх мерках позна), дастаткова лагічны. Нам не спатрэбілася змяняць заканадаўства. Наша сістэма прыняцця рашэнняў і так ёй адпавядае. Галоўная занепакоенасць Эстонскага парламента і Савета міністраў палягала ў тым, што Канвенцыя прывядзе да павышэння бюджэтнага цяжару ў сферы спадчыны, што яна накладзе вялікія абавязкі на дзяржаву. Аднак мы ўжо даўно пачалі змяняць заканадаўства ў накірунку прыняцця дэмакратычных прынцыпаў кіравання спадчынай. Так што нават дзіўна, чаму было столькі супраціва з боку чыноўнікаў. Бо мы і так усё гэта выконваем.

Вы з'яўляецеся адной з галоўных прамоўтэрак дакумента пад назвай «Зялёная кніга культурнай спадчыны Еўропы» (European Cultural Heritage Green Paper), прысвечанага ролі культурнай спадчыны ў супрацьстаянні глабальнаму пацяпленню. Ці бачыце вы ўплыў ідэй, змешчаных у гэтым дакуменце, на сістэму кіравання культурнай спадчынай Эстоніі?

Так, я папулярызую гэты дакумент, а яго галоўны аўтар – амерыканскі юрыст Эндру Потс, былы выканаўчы дырэктар Нацыянальнага камітэта ІКАМОС у ЗША і каардынатар рабочай групы ІКАМОСа па змене клімату.

Я асабіста (і, наколькі ведаю, некаторыя мае эстонскія калегі таксама) выкарыстоўваю агучаныя там аргументы для таго, каб упэўніць палітыкаў і чыноўнікаў у тым, што ў дыскусіі аб зменах клімата сфера культурнай спадчыны можа адыграць неацэнную ролю. Гэта «Зялёная кніга» змяшчае шмат прыкладаў добрых падыходаў і праектаў, прысвечаных ролі спадчыны ў стварэнні экалагічна-устойлівай гаспадаркі, якія працуюць як аргументы, калі вам трэба пераканаць суразмоўцаў высокага ранга ў сапраўднай важнасці сектара спадчыны. Калі вы праводзіце перамовы з рознымі міністэрствамі, можна карыстацца «Зялёнай кнігай» як своеасаблівым даведнікам. Вось, напрыклад, зараз, калі мы будзем размаўляць з імі пра выкананне Еўрапейскай дырэктывы аб энергетычных характарыстыках будынкаў, я абавязкова ізноў буду прыводзіць тыя ж самыя аргументы з «Зялёнай кнігі».

Вайна ва Ўкраіне – ці ўплывае яна на дыскусіі і працэсы вакол культурнай спадчыны ў Эстоніі? Таму што, напрыклад, у Літве з пачаткам вайны пазіцыя грамадства у адносінах да савецкай спадчыны стала куды больш непрымірымай.

У першую чаргу, мы ізноў убачылі, як агрэсар мэтанакіравана цэліць у аб'екты спадчыны дзеля дэмаралізацыі сваёй ахвяры. Расіяне сапраўды знішчылі шмат гістарычных будынкаў і музеяў. Адначасова паўстае іншая праблема, якая таксама становіцца праблемай ІКАМОСа: ва Ўкраіне дасюль няма поўных спісаў гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Гэта таксама падстава нам агледзецца – ці ўсё мы зарэгістравалі тут, у Эстоніі? Ці мы падрыхтаваныя да аналагічнага крызіса, калі, скажам, расійская ракета патрапіць у царкву ці музей? Ці алічбаваныя яго калекцыі? Мы акурат гэтым цяпер займаемся, і ўжо нават можам нечаму навучыць іншых.

Канешне, вялікі непакой выклікае працэс аднаўлення. Вось я нядаўна ўдзельнічала ў размове, дзе выказваўся пункт гледжан-

ня, што некаторыя мясціны ва Ўкраіне і так былі непрывабнымі, і цяпер ліквідацыя наступстваў вайны – гэта шанец зрабіць іх прыгожымі ды сучаснымі. Але калі гэта аб'екты культурнай спадчыны, мы мусім быць вельмі асцярожныя! Трэба вучыць людзей, тлумачыць ім.

Разуменне савецкай спадчыны таксама змянілася. Ва Ўкраіне гэты перыд гісторыі быў даўжэйшы, чым у Эстоніі. Гэта высокаіндустрыялізаваная краіна, у якой ёсць гарады, практычна адзіная спадчына якіх – савецкая. Але нягледзячы на тое, што Расія стала ворагам і пачварна інструменталізуе савецкі перыяд гісторыі дзеля дасягнення сваіх мэтаў, гэта спадчына ўсё адно належыць гэтай зямлі, належыць нам. Тое ж тычыцца і Эстоніі. Напрыклад, горад Сілламяэ, адзін з асноўных прамысловых цэнтраў Эстоніі, амаль цалкам пабудаваны ў часы Эстонскай ССР. З пачаткам вайны наданне яму ахоўнага статуса было адкладзена на невызначаны час. Уся дакументацыя была падрыхтаваная. Гэта, як Вы ведаеце, патрабуе шмат працы. Чакалася, што гораду будзе нададзены статус ахоўнай тэрыторыі. Але пачалася вайна, і цяпер высілкі па захаванні савецкага сталі, так бы мовіць, несвоечасовымі. З іншага боку, гэта таксама гісторыя, якую нельга сцерці.

Яшчэ ў нас шмат дыскусій адбываецца наконт так званых «чырвоных помнікаў», частка якіх была ўжо знесена, іх не так шмат засталося, але цяпер адбылася палярызацыя думак сярод палітыкаў, гісторыкаў і мастацтвазнаўцаў наконт каштоўнасці гэтых аб'ектаў. Дарэчы, было дастаткова дзіўна назіраць, як хутка гэтыя дыскусіі сціхлі пасля выбараў у сакавіку бягучага года. То бок абмеркаванне помнікаў стала часткай гэтага перадвыбарнага працэса. Палітычныя партыі вырашылі, што калі яны здолеюць дамагчыся зноса гэтах помнікаў, то атрымаюць болей галасоў.

Маё апошняе пытанне: якія выклікі сферы культурнай спадчыны могуць быць прадбачаныя ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве? Што новага будзе на парадку дня праз 20 ці 30 гадоў?

Ну, у такой доўгай перспектыве даволі цяжка прадказваць. Але можна падумаць пра вялікую хвалю глабальнай міграцыі, якая ўжо адбываецца. Яна, а таксама працяг глабалізацыі прывядуць да ўзмацнення праблемы захавання лакальнай ідэнтычнасці, нават нацыянальнай ідэнтычнасці. Прыдзецца шукаць спосабы культурнага суіснавання з мігрантамі. Што нас чакае, можна прыкладна ўбачыць, калі паглядзець на сённяшнія Нідэрланды,

Францыю ці Велікабрытанію. Там гэта адбываецца ўжо даўно, а вось для краін Усходняй Еўропы такое суіснаванне можа стаць новым выклікам. І гэта мае непасрэднае дачыненне да захавання культурнай спадчыны.

Таксама ўся праблематыка устойлівага развіцця, энергетычнай эфектыўнасці – яна толькі ўзмацніцца. Мы ўжо пачынаем змяняць нацыянальнае заканадаўства, каб рэагаваць на найноўшыя выклікі. Гэты працэс будзе працягвацца. Мы ўсё больш будзем гаварыць не столькі пра асобныя помнікі, пра асобныя будынкі, колькі пра гістарычнае асяроддзе ў цэлым.

Размову вёў Сцяпан Стурэйка.